# § 38–39. Палітычнае развіццё Беларусі ў XVI–XVIII стст.

ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ
РЭЧ ПАСПАЛІТАЯ
СОЙМ ЛІБЕРУМ ВЕТА
СТАНІСЛАЎ ПАНЯТОЎСКІ
КАНФЕДЭРАЦЫЯ
СТАТУТ ЛІВОНСКАЯ ВАЙНА
ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА ЛЕЎ САПЕГА

**1. Дзяржаўны лад ВКЛ у першай палове XVI ст.** У першай палове XVI ст. ВКЛ распасціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора і з'яўлялася адной з найбуйнейшых дзяржаў Еўропы. У яго склад уваходзілі сучасныя беларускія, літоўскія, украінскія, а таксама некаторыя польскія і расійскія землі. Беларускія землі знаходзіліся ў самым цэнтры дзяржавы і былі добра развітым краем, таму займалі важнае месца ў палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці дзяржавы.

**Фарміраванне саслоўна-прадстаўнічай манархіі**

Назавіце прывілеяваныя саслоўі ў ВКЛ.

ВКЛ у пачатку XVI ст. было саслоўна-прадстаўнічай манархіяй. Яшчэ ў другой палове XV ст. у дзяржаве афарміліся новыя органы ўлады — *сойм* і *Рада* ВКЛ (паны-рада). Прывілей вялікага князя літоўскага Аляксандра ў 1492 г. значна пашырыў кампетэнцыі Рады ВКЛ. Яна ператварылася з дарадчага ў распарадчы орган. У яе паўнамоцтвы ўваходзілі выданне законаў, арганізацыя абароны дзяржавы, вырашэнне міжнародных пытанняў, разгляд найважнейшых судовых спраў. Асноўную ролю ў прыняцці дзяржаўных рашэнняў адыгрывала *«праднейшая рада»*, якая з'яўлялася ядром Рады ВКЛ.

## РАДА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА




Растлумачце, чаму ў Раду ўваходзілі прадстаўнікі толькі каталіцкай царквы.

У першай палове XVI ст. вырасла роля сойма, які вырашаў найважнейшыя пытаннні дзяржаўнага жыцця, такія як абранне вялікага князя, абвяшчэнне вайны і заключэнне міру. У перыяд працы сойма Рада ВКЛ рабілася яго часткай. Ад 1511 г. для ўдзелу ў вальных соймах абіралі *паслоў* — прадстаўнікоў шляхты ад кожнага павета.

**Сістэма мясцовага самакіравання**

Да 1566 г. канчаткова сфарміравалася новая адміністрацыйна-тэрытарыяльная сістэма. На змену княствам і намесніцтвам прыйшлі *ваяводствы*, якія дзяліліся на *паветы*. Ваяводы і старасты, што іх узначальвалі, разам з падваяводамі, падстарастамі, маршалкамі павятовымі і іншымі службовымі асобамі прадстаўлялі мясцовую адміністрацыю. На рэгіянальным узроўні аформіліся і мясцовыя шляхецкія сходы — *павятовыя соймікі*.

**I Статут ВКЛ**

**2. Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гг.** Пастунальнае развіццё дзяржавы і грамадства патрабавала стварэння і ўдасканалення заканадаўства. З гэтай мэтай пад кіраўніцтвам канцлера Альбрэхта Гаштольда быў падрыхтаваны і ў **1529 г.** Жыгімонтам I Старым зацверджаны *Статут ВКЛ*. Статут рэгуляваў правы і абавязкі манарха, рэгламентаваў дзейнасць дзяржаўных органаў улады, вызначаў прававое становішча саслоўяў. Улічваючы еўрапейскую прававую




- **ВІЛЬНЯ** — Сталіца ВКЛ
- **ПОЛАЦК** — Цэнтры ваяводстваў ВКЛ
- РЭЧЫЦА — Цэнтры паветаў ВКЛ
- НЯСВІЖ — Іншыя гарады
- Парэчча — Мястэчкі

ГРАНІЦЫ
- дзяржаў у 1569 г.
- залежных дзяржаў і паміж ВКЛ і Каралеўствам Польшча
- ваяводстваў ВКЛ (Рэчы Паспалітай)
- паветаў ВКЛ (Рэчы Паспалітай)
- сучаснай Рэспублікі Беларусь

Тэрыторыя Мазырскага павета, створанага ў 1566 г. у складзе Кіеўскага ваяводства; пасля 1569 г. застаўся ў складзе ВКЛ (далучаны да Мінскага ваяводства)

Лічбамі на карце пазначаны:
1 – Курляндскае і Земгальскае герцагства (васал Рэчы Паспалітай); 2 – Задзвінскае княства (з 1566 г. – у складзе ВКЛ, з 1569 г. – сумеснае валоданне Каралеўства Польшча і ВКЛ); 3 – Герцагства Прусія; 4 – Троцкае ваяводства; 5 – Віленскае ваяводства; 6 – Полацкае ваяводства; 7 – Віцебскае ваяводства; 8 – Брэсцкае ваяводства; 9 – Навагрудкае ваяводства; 10 – Мінскае ваяводства; 11 – Мсціслаўскае ваяводства

*Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ*

На колькі ваяводстваў дзялілася ВКЛ у сярэдзіне XVI ст.? У склад якога ваяводства ўваходзіла ваша мясцовасць?

практыку свайго часу, Статут 1529 г. усталёўваў прававыя нормы для жыхароў ВКЛ, не зважаючы на саслоўную прыналежнасць.

**II Статут ВКЛ**

Змены, якія адбыліся ў жыцці грамадства і дзяржавы ў першай палове XVI ст., запатрабавалі дапрацоўкі заканадаўства. Падрыхтоўкай новай рэдакцыі Статута займалася камісія на чале з канцлерам Мікалаем Радзівілам Чорным. Зацверджаны ў **1566 г.** Жыгімонтам II Аўгустам Статут паспрыяў уніфікацыі прававых нормаў, судовай сістэмы, адміністрацыйнага падзелу ВКЛ і Польшчы. У Статуце 1566 г. абвяшчалася прэзумпцыя невінаватасці, прыярытэт пісанага права, уводзіўся ўзрост адказнасці за злачынства, прадугледжвалася аддзяленне судовай улады ад выканаўчай.

**3. Утварэнне Рэчы Паспалітай.** Працэс збліжэння ВКЛ і Польшчы, які пачаўся яшчэ ў XIV ст., завяршыўся ў 1569 г. узнікненнем на палітычнай карце Еўропы новага дзяржаўнага ўтварэння — *Рэчы Паспалітай*.

Пасля падпісання ў 1385 г. Крэўскай уніі адбываліся працэсы збліжэння дзяржаўных і прававых сістэм абедзвюх дзяржаў. Асабліва прывабнае для шляхціцаў ВКЛ было становішча шляхты ў Польшчы, дзе яна мела роўны прававы статус з *магнатамі*. Галоўнай прычынай заключэння новай міждзяржаўнай уніі выступіла цяжкае знешнепалітычнае становішча ВКЛ, выкліканае Лівонскай вайной. У выніку паспяховых наступаў рускай арміі на тэрыторыі Беларусі ўзнікла рэальная пагроза страты незалежнасці княства. У гэтых умовах беларуская і літоўская шляхта звярнулася да ідэі саюзу з Польшчай.

Як вы лічыце, утварэнне Рэчы Паспалітай — гэта 200-гадовае паслядоўнае збліжэнне або вынік збегу акалічнасцей?

**Работа Люблінскага сойма**

10 студзеня 1569 г. пачалася работа *Люблінскага сойма*. Дэлегацыя ВКЛ імкнулася да заключэння абарончага саюзу з Польшчай і правядзення агульнай знешняй палітыкі. Польскі бок настойваў на інкарпарацыі (уключэнні) ВКЛ у склад Польшчы,

што выклікала пратэст дэлегацыі ВКЛ на чале з Мікалаем Радзівілам Рудым, якая пакінула Люблін. У адказ Жыгімонт II Аўгуст, абапіраючыся на прапольскія памкненні часткі шляхты ВКЛ, пачаў працэс інкарпарацыі асобных ваяводстваў княства. У склад Польшчы былі ўключаны Падляшша, Падолле, Валынь і Кіеўшчына. Мазырскі павет, паслы якога не падтрымалі план інкарпарацыі, быў выдзелены са складу Кіеўскага ваяводства і ўключаны ў Мінскае. ВКЛ, страціўшы траціну сваёй тэрыторыі, ва ўмовах працягу Лівонскай вайны трапіла ў яшчэ цяжэйшае становішча. Дэлегацыя ВКЛ на чале з Янам Хадкевічам вярнулася на Люблінскі сойм і працягнула перамовы. У выніку быў распрацаваны кампрамісны варыянт уніі, які прадугледжваў захаванне дзяржаўнасці ВКЛ.

Стварэнне новай дзяржавы

**1** ліпеня **1569 г.** быў падпісаны акт Люблінскай уніі ВКЛ і Польшчы, у адпаведнасці з якім ствараласся *федэратыўная дзяржава* — Рэч Паспалітая. Згодна з умовамі уніі ВКЛ і Польшча мелі як агульныя, так і ўласныя органы ўлады і сферы дзяржаўнай дзейнасці. Пры гэтым кожная дзяржава захоўвала аўтаномію.

Нягледзячы на фармальную палітычную роўнасць, польскі ўплыў у новай дзяржаве быў вызначальным. Працэс паланізацыі беларускай, літоўскай і ўкраінскай шляхты значна паскорыўся. Прыняцце польскіх культурных традыцый і мовы рабілася неабходнай умовай для выбудоўвання палітычнай кар'еры. Гэта збліжала беларускую, літоўскую і ўкраінскую шляху з польскай, аддаляла яе тым самым ад іншых сацыяльных пластоў ВКЛ, найперш сялянства і значнай часткі мяшчан.

Становішча шляхты ВКЛ у складзе новай дзяржавы

**4. Барацьба ВКЛ за самастойнасць.** Вынікі Люблінскай уніі не задаволілі ні шляхту ВКЛ, якая ў поўнай меры так і не атрымала «залатых вольнасцей», ні магнатаў, роля якіх у палітычным жыцці новай дзяржавы істотна знізілася. Гэтыя фактары

## ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ЗГОДНА З ЛЮБЛІНСКАЙ УНІЯЙ

| АГУЛЬНЫЯ для ВКЛ і Польшчы | АСОБНЫЯ для ВКЛ і Польшчы |
|---|---|
| Манарх *(кароль польскі, вялікі князь літоўскі; каранаваўся толькі ў Кракаве)* | Дзяржаўны апарат кіравання |
| Сойм *(вышэйшы орган улады)* | Заканадаўства |
| Знешняя палітыка | Судовая сістэма |
| Правы феадалаў абедзюх дзяржаў набываць маёнткі на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай | Войска |
| | Грашовая адзінка |
| | Мова справаводства |
| | Дзяржаўная пячатка |

Назавіце элементы палітычнай самастойнасці ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай.

абцяжарваліся эканамічнай канкурэнцыяй з польскай шляхтай, якая цяпер мела доступ да зямельных рэсурсаў ВКЛ.

**Адстойванне дзяржаўных інтарэсаў ВКЛ**

У кіроўных колах ВКЛ атрымала развіццё тэндэнцыя да перагляду ўмоў Люблінскай уніі. Ужо ў 1576 г. новы манарх Рэчы Паспалітай *Стэфан Баторый* (1576–1586 гг.) быў вымушаны пацвердзіць поўную самастойнасць ВКЛ, абавязваўся пашыраць яго межы і не прызначаць палякаў на пасады гетманаў. У 1581 г. у ВКЛ быў створаны найвышэйшы судовы орган краіны — *Галоўны Трыбунал*, што замацоўвала незалежнасць судовай сістэмы княства ад Польшчы.

У перыяд праўлення Стэфана Баторыя камісія пад кіраўніцтвам канцлера *Астафія Валовіча* і падканцлера *Льва Сапегі* падрыхтавала трэцюю рэдакцыю Статута ВКЛ. Новы манарх Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза, каб заручыцца падтрымкай ВКЛ,

у **1588 г.** пагадзіўся на яго прыняцце. Новы зборнік законаў карэктаваў умовы Люблінскай уніі, замацоўваў і юрыдычна афармляў незалежнасць княства. Ён абавязваў манарха вярнуць адарваныя ад ВКЛ землі, забараняў прызначаць на дзяржаўныя пасады і надзяляць зямлёй іншаземцаў, у тым ліку палякаў, захоўваў адасобленасць дзяржавы. Як і папярэднія, Статут 1588 г. быў падрыхтаваны на старабеларускай мове.

Насуперак умовам Люблінскай уніі, у ВКЛ на працягу другой паловы XVI — XVII ст. працягвалі збірацца соймы. У 1673 г. беларуска-літоўская шляхта дабілася прыняцця рашэння, згодна з якім кожны трэці вальны сойм Рэчы Паспалітай павінен быў праходзіць у Гродне.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Гродна абралі як месца правядзення кожнага трэцяга вальнага сойма. Гэты горад меў асаблівае становішча. Пра яго высокі статус і слаўную гісторыю сведчаць два замкі — Стары (Верхні) і Новы (Ніжні). У XVII ст. канцлер Х. Ж. Пац адбудаваў Стары замак, каб праводзіць у ім соймы Рэчы Паспалітай. Магнаты, якія прыязджалі на соймы, адзін за другім пабудавалі тут уласныя палацы. Дзякуючы слаўнай гістарычнай спадчыне сучаснае Гродна часта называюць «тройчы каралеўскім горадам».

1. *Назавіце імёны трох кіраўнікоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, дзякуючы якім Гродна празвалі каралеўскім горадам.*
2. *Як вы лічыце, чаму для шляхты ВКЛ было так важна праводзіць сойм на землях княства?*
3. *Чаму з усіх гарадоў ВКЛ менавіта Гродна абралі для правядзення вальнага сойма? Як гэта адбілася на жыцці самога горада?*
4. *Даведайцеся, якую гісторыка-культурную спадчыну сваёй каралеўскай мінуўшчыны захоўвае сучасны Гродна.*

Такім чынам, у другой палове XVI — XVII ст. шэраг палажэнняў Люблінскай уніі быў перагледжаны на карысць ВКЛ, аднак залежнасць ад Польшчы заставалася даволі моцная. З 1697 г. мовай справаводства ВКЛ стала польская. Шляхта беларускіх і лі-

тоўскіх зямель да таго часу лічыла польскую мову сваёй роднай. У XVIII ст. усю Рэч Паспалітую пачалі неафіцыйна называць Польшчай, а ВКЛ, пры фармальным захаванні яго дзяржаўнага статусу, — «Літоўскай правінцыяй».

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У Рэчы Паспалітай ад 1573 г. паўнамоцтвы манарха вызначаліся Генрыхавымі артыкуламі і Пакта канвента.

| Генрыхавы артыкулы | Пакта канвента |
| --- | --- |
| акт, які вызначаў асновы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і паўнамоцтвы манарха | пагадненне паміж шляхтай і абраным манархам, у якім вызначаліся ўмовы абрання на прастол Рэчы Паспалітай |
| • вольнае абранне караля шляхтай;<br>• свабода хрысціянскага веравызнання;<br>• абавязак манарха збіраць сойм адзін раз на два гады;<br>• забарона каралю абвяшчаць вайну, збіраць шляхецкае апалчэнне, усталёўваць новыя падаткі і пошліны без згоды сойма;<br>• правы шляхты адмовіцца ад падпарадкавання каралю (стварыць канфедэрацыю) і выступіць са зброяй (рокаш) супраць яго ў выпадку парушэння дамоўленасцей | абавязкі манарха:<br>• аказанне фінансавай дапамогі дзяржаве;<br>• выплата даўгоў папярэдняга караля;<br>• захаванне шляхецкіх вольнасцей;<br>• непрымяненне арміі супраць шляхты і інш. |
| Заставаліся нязменнымі, кожны новы манарх мусіў пацвярджаць гэты дакумент | Складаліся асобна для кожнага манарха |

1. *Растлумачце, чаму Рэч Паспалітую называлі «шляхецкай рэспублікай», а яе палітычную сістэму — «шляхецкай дэмакратыяй».*
2. *Выбары манарха ў Рэчы Паспалітай — гэта ўнікальная рыса ці характэрная для таго часу?*
3. *Як вы лічыце, якія будучыя праблемы ў развіцці Рэчы Паспалітай заклалі Генрыхавы артыкулы і Пакта канвента? Аргументуйце свой адказ.*
4. *Даведайцеся, як склалася жыццё Генрыха Валуа — першага выбарнага караля Рэчы Паспалітай, што падпісаў згаданыя дакументы.*

**Аслабленне манархічнай улады ў Рэчы Паспалітай**

**5. Прычыны ўнутрыпалітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай.** Стварэнне Рэчы Паспалітай прывяло да значных змен у дзяржаўным ладзе. Фармальна кіраўніком дзяржавы заставаўся манарх, але рэальная ўлада перайшла да вальнага дзвюхпалатнага сойма.

## СОЙМ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

СОЙМ

«Ліберум вета»



**СЕНАТ**

- прадстаўнікі каталіцкага духавенства;
- вышэйшыя ўраднікі;
- частка членаў Рады ВКЛ і Кароны Польскай

**ПАСОЛЬСКАЯ ІЗБА**

- паслы (прадстаўнікі шляхты)

- абранне манарха;
- скліканне шляхецкага апалчэння;
- абвяшчэнне вайны і заключэнне міру;
- устанаўленне падаткаў са шляхты для вядзення вайны;
- наданне шляхецкай годнасці

Развіццё шляхецкіх вольнасцей, што абмяжоўвалі ўладу караля, давалі магнатам і шляхце магчымасць непадпарадкавання манарху, спрыяла аслабленню дзяржавы і ўзмацненню ўплыву магнацкіх груповак.

На соймах Рэчы Паспалітай афармілася права *liberum veto* («не дазваляю»). Гэта азначала, што ўсе рашэнні сойма павінны былі прымацца аднагалосна. Нават адзін дэпутат мог сарваць рашэнне сойма, наклаўшы на яго вета, і тым самым паралізаваць работу вышэйшага заканадаўчага органа і ўсёй дзяржавы ў цэлым. З 1669 да 1763 г. было сарвана

53 пасяджэнні сойма са 137. У заходнееўрапейскіх краінах для процідзеяння шляхце манархі выкарыстоўвалі «трэцяе саслоўе» — мяшчанства, але ў Рэчы Паспалітай цалкам залежны ад феадалаў кароль гэтага зрабіць не мог.

Пераход да магнацкай алігархіі

У апошняй чвэрці XVII ст. разгарнулася барацьба магнацкіх груповак за ўладу. У ёй удзельнічалі многія магнацкія роды (Сапегі, Радзівілы, Агінскія, Вішнявецкія, Пацеі і інш.), уступаючы ў часовыя саюзы адны з аднымі. Барацьба магнацкіх груповак не спынялася і ў XVIII ст.

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай імкліва прыходзіў у заняпад, саслоўная манархія ператварылася ў анархію, у самавольства магнацкіх груповак, якія маніпулявалі дзяржаваю, пагарджалі прававымі нормамі. Усякія захады манархаў умацаваць каралеўскую ўладу прыводзілі да жорсткага супрацьдзеяння з боку магнатаў і шляхты, якія ствралі канфедэрацыі і распачыналі баявыя дзеянні супраць караля.

Ва ўнутрыпалітычны крызіс умяшаліся замежныя дзяржавы, якія імкнуліся да захавання існуючага ладу ў Рэчы Паспалітай, выступалі гарантамі «залатых шляхецкіх вольнасцей». Падчас свайго спаборніцтва групоўкі магнатаў і шляхты звярталіся да замежных дзяржаў па дапамогу.

Няспыннае супрацьстаянне

**6. Спробы рэформаў. Першы падзел Рэчы Паспалітай.** Глыбокі ўнутрыпалітычны крызіс, у якім апынулася дзяржава, патрабаваў правядзення неадкладных і рашучых рэформаў. Пасля смерці Аўгуста III прыхільнікі ўзмацнення Рэчы Паспалітай выступілі за правядзенне рэформаў і падтрымалі абранне каралём Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764–1795 гг.), які прыняў троннае імя Аўгуст IV.

Рэформы Чартарыйскіх

На сойме 1764 г. магнацкая групоўка Чартарыйскага выступіла з праграмай рэформаў, якія закранулі практычна ўсе галіны жыцця грамадства.

## РЭФОРМЫ ЧАРТАРЫЙСКІХ

### ЭКАНАМІЧНЫЯ

- ліквідацыя мытні паміж ВКЛ і Польшчай, прыватных мытных пунктаў і пошлін;
- уніфікацыя сістэм меры і вагі;
- ліквідацыя юрыдык;
- перадача каралеўскіх эканомій у дзяржаўнае кіраванне



*Канцлер ВКЛ М. Ф. Чартарыйскі*

### ПАЛІТЫЧНЫЯ

- абмежаванне выкарыстання «ліберум вета» па эканамічных пытаннях;
- абмежаванне палітычнай улады гетманаў шляхам стварэння Вайсковай камісіі ВКЛ;
- абранне каралём толькі кандыдата з Рэчы Паспалітай

### СУДОВЫЯ

- удасканаленне паўнамоцтваў Галоўнага Трыбунала ВКЛ

Прааналізуйце рэформы, прапанаваныя магнацкай групоўкай Чартарыйскіх. Якімі маглі быць наступствы гэтых рэформаў у выпадку іх рэалізацыі?

### Дысідэнцкае пытанне

Намер правесці ў краіне рэформы выклікаў незадавальненне часткі магнатаў і суседніх дзяржаў. Для ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай яны выкарысталі «дысідэнцкае пытанне» (пытанне нераўнапраўнага становішча некаталікоў).

Пры падтрымцы Расіі і Прусіі былі створаны праваслаўная Слуцкая і пратэстанцкая Торуньская канфедэрацыі, якія ў 1768 г. дабіліся, каб каталікі і **дысідэнты** атрымалі роўныя правы.

**Дысідэнты** — назва хрысціян-некаталікоў у Рэчы Паспалітай.

### Пачатак падзелаў Рэчы Паспалітай

Поспех дысідэнтаў выклікаў незадавальненне значнай часткі каталіцкай шляхты, якая, абапіраючыся на Францыю, у 1768 г. стварыла Барскую канфедэрацыю. З 1768 да 1772 г. паміж барскімі канфедэратамі, з аднаго боку, і каралеўскімі і расійскімі войскамі, з другога, разгарнуліся баявыя дзеянні.

Поўнае паражэнне Барскай канфедэрацыі ў сакавіку 1772 г. дало магчымасць суседнім дзяржавам

пачаць падзел Рэчы Паспалітай. У 1772 г. у Пецярбургу было падпісанае пагадненне паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй аб частковым падзеле Рэчы Паспалітай. Аўстрыя заняла Галіцыю, Прусія атрымала польскае Памор'е (без порта Гданьск), да Расіі адышлі Усходняя Беларусь і частка Прыбалтыкі (Інфлянты). Варшаўскі сойм 1773–1775 гг. зацвердзіў першы падзел Рэчы Паспалітай.

Што дазволіла замежным дзяржавам умешвацца ва ўнутраную палітыку Рэчы Паспалітай?

Пасол ад Навагрудскага ваяводства Тадэвуш Рэйтан пасля прамовы на сойме ў знак пратэсту лёг перад пасламі на падлозе ў дзвярах. Але гэты ўчынак не аказаў маральнага ўплыву на пазіцыю шляхецкай большасці сойма.



*Тадэвуш Рэйтан. Падзенне Польшчы. Фрагмент. Мастак Я. Матэйка. 1866 г.*

**7. Апошнія гады Рэчы Паспалітай.** Першы падзел Рэчы Паспалітай актывізаваў прыхільнікаў рэформаў. У 1788–1792 гг. засядаў *Чатырохгадовы сойм*. На ім быў прыняты шэраг важных рашэнняў. Беззямельная шляхта страціла права выбіраць паслоў на сойм, а заможныя мяшчане такое права атрымалі. Яны таксама маглі набываць зямельныя ўладанні, атрымліваць шляхецкую годнасць. Было прынята рашэнне павялічыць армію Рэчы Паспалітай да 100 тыс. чалавек.

Новая спроба рэформаў

Як вы лічыце, ці маглі рашэнні Чатырохгадовага сойма вывесці дзяржаву з крызісу?

**3 мая 1791 г.** была прынятая Канстытуцыя, якая істотна змяніла дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Яна абмяжоўвала шляхецкія вольнасці і ўмацоўвала

Першая Канстытуцыя ў Еўропе

каралеўскую ўладу, прадугледжвала яе перадачу ў спадчыну. Рэч Паспалітая рабілася ўнітарнай дзяржавай, што вяло да страты дзяржаўнасці ВКЛ. Адмянялася права «ліберум вета», забаранялася стварэнне канфедэрацый. Рэалізацыя палажэнняў Канстытуцыі дазваляла пераадолець палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай.

**Таргавіцкая канфедэрацыя**

Прыняцце Канстытуцыі выклікала незадавальненне як унутры краіны, асабліва сярод магнатаў і часткі шляхты, так і ў суседніх дзяржаў. Пры падтрымцы Расіі была створана Таргавіцкая канфедэрацыя, якая звярнулася ў Пецярбург па ваенную дапамогу. У маі 1792 г. у Рэч Паспалітую ўвайшлі расійскія войскі, якія занялі тэрыторыю Беларусі і Правабярэжнай Украіны. Кароль далучыўся да таргавічан і фактычна капітуляваў. Неўзабаве свае войскі ў Рэч Паспалітую ўвяла Прусія. Канстытуцыя 1791 г. і ўсе рашэнні Чатырохгадовага сойма былі адмененыя.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Канстытуцыі 3 мая 1791 г.**

Усякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак з волі народа. І каб цэласнасць дзяржавы, свабода грамадзян і грамадскі парадак заставаліся назаўсёды ў раўнавазе, урад народа польскага павінен складацца, і воляю сапраўднага закона заўсёды будзе складацца, з трох улад, г. зн. заканадаўчай улады ў (руках) аб'яднаных саслоўяў, вышэйшай выканаўчай улады ў (руках) караля і варты (міністраў), улады судовай у юрысдыкцыйных (органаў), якія ўсталяваны для гэтай мэты або якія маюць быць усталяваны. Сойм або аб'яднаныя саслоўі будуць дзяліцца на дзве палаты: на палату пасloў і палату сенатараў пад старшынствам караля. Палата паслоў, як адлюстраванне і ўвасабленне ўсеўладдзя народа, будзе святыняй заканадаўства.

1. *Якая тэорыя дзеячаў Асветніцтва знайшла рэалізацыю ў Канстытуцыі Рэчы Паспалітай?*
2. *Знайдзіце ў тэксце адказы на пытанні:*
   а) *хто з'яўляецца крыніцай улады ў дзяржаве і як гэта рэалізоўвалася на практыцы ў Рэчы Паспалітай;*
   б) *якія каштоўнасці абвяшчала і адстойвала дадзеная Канстытуцыя.*
3. *Чаму Канстытуцыю 3 мая 1791 г. лічаць першай сучаснай канстытуцыяй у Еўропе?*

### Другі падзел краіны

У студзені 1793 г. паміж Прусіяй і Расіяй была падпісана дамова аб другім падзеле Рэчы Паспалітай. Прусія атрымала заходнія землі Польшчы з гарадамі Торунь, Познань, Гданьск, Расія — цэнтральную частку Беларусі і Правабярэжную Украіну. Умовы другога падзелу Рэчы Паспалітай былі зацверджаны на сойме ў Гродне.

Другі падзел і прысутнасць іншаземных войскаў у краіне выклікалі імкненне часткі мясцовых эліт адрадзіць дзяржаву ў ранейшай яе велічы шляхам узброенага выступлення. У сакавіку **1794 г.** у Кракаве пачалося паўстанне, якое ўзначаліў *Тадэвуш Касцюшка*. Паўстанцы выступалі за аднаўленне Канстытуцыі 1791 г. і працяг буржуазных рэформаў. Кароль быў фактычна адхілены ад улады.



*Помнік Т. Касцюшку на яго радзіме. Хутар Мерачоўшчына. Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці*

У гісторыю якіх народаў зрабіў унёсак ураджэнец Беларусі Тадэвуш Касцюшка?

На тэрыторыі ВКЛ узброеная барацьба працягвалася з красавіка да лістапада. Кіраваў паўстаннем у ВКЛ *Якуб Ясінскі*, ён стварыў незалежны ад Польшчы орган кіравання паўстанцамі — Найвышэйшую Раду ВКЛ. У мэтах прыцягнення ў шэрагі паўстанцаў сялян Т. Касцюшка выдаў Паланецкі універсал. Дакумент абвяшчаў магчымасць даравання сялянам асабістай свабоды пры ўмове іх разліку з феадалам, скарачэнне паншчыны, права сялян на зямлю, якую яны апрацоўвалі.

### Канчатковы падзел Рэчы Паспалітай

Ва ўмовах адсутнасці масавай падтрымкі з боку сялян і мяшчан дабіцца перамогі было надзвычай складана. Аслаблялі пазіцыі паўстанцаў і ўнутраныя супярэчнасці. У кастрычніку 1794 г. у бітве каля Мацяёвіц асноўныя сілы паўстанцаў былі разбітыя, Т. Касцюшка захоплены ў палон. Расійскія войскі ўступілі ў Варшаву.

У кастрычніку 1795 г. Аўстрыя, Прусія і Расія падпісалі дамову аб канчатковым падзеле Рэчы Паспалітай. Да Аўстрыі адышлі землі паўночна-ўсходняй Польшчы, да Прусіі — цэнтральная і паўночна-ўсходняя Польшча, у склад Расійскай імперыі ўвайшлі заходнія землі Беларусі.

Прасачыце па картасхеме, змешчанай на форзацы, тэрытарыяльныя змены, што адбыліся ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай.

*У сярэдзіне XVI ст. беларускія землі, з'яўляючыся часткай ВКЛ, увайшлі ў склад новай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. Афіцыйна гэта была федэратыўная дзяржава, аднак у далейшым ВКЛ давялося адстойваць сваю дзяржаўную незалежнасць. Унутры- і знешнепалітычны крызісы ў Рэчы Паспалітай у XVII–XVIII стст. прывялі да яе паслядоўнага аслаблення. У выніку трох падзелаў суседнімі дзяржавамі Рэч Паспалітая знікла з карты Еўропы. Падзелы Рэчы Паспалітай былі заканамерным вынікам нежадання вышэйшай знаці паставіць дзяржаўныя інтарэсы вышэй за ўласныя карыслівыя інтарэсы.*

**калі ў свеце…**

1581 г. — стварэнне Рэспублікі Злучаных правінцый у выніку Нідэрландскай рэвалюцыі

**на тэрыторыі Беларусі…**

1569 г. — утварэнне Рэчы Паспалітай у выніку падпісання Люблінскай уніі

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Ахарактарызуйце дзяржаўны лад ВКЛ у першай палове XVI ст. Якія рысы палітычнага развіцця ў гэты перыяд былі агульныя для ВКЛ і іншых краін Еўропы?
2. На аснове тэксту параграфа запоўніце табліцу «Статуты ВКЛ». У чым, на вашу думку, заключалася ўдасканаленне заканадаўства ВКЛ?

| Статут | Год прынящця | Асноўны змест |
|---|---|---|
| I | | |
| II | | |
| III | | |

3. Ахарактарызуйце прычыны і наступствы Люблінскай уніі. Выкарыстоўваючы памятку на с. 300, дайце ацэнку гэтаму гістарычнаму факту.
4. Ахарактарызуйце становішча беларускіх зямель і беларускага народа ў складзе Рэчы Паспалітай. Як яно мянялася з XVI па XVIII ст.? Чым былі абумоўлены змены?
5. Складзіце схему «Прычыны падзелаў Рэчы Паспалітай». Чаму, на вашу думку, вучыць гісторыя Рэчы Паспалітай?